УДК 947.6. «1917»

І.М. Рыжанкоў, дац., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ (САКАВІК-МАЙ 1917 г.)

На пачатковым этапе разгортвання Лютаўскай рэвалюцыі справай азнаямлення вяскоўцаў з палітычнай, харчовай, ваеннай і іншымі праграмамі Часовага ўрада мусілі займацца ўрадавыя, земскія і рэлігійныя ўстановы – па сродках адозваў, зваротаў, мітынгаў, сходаў і малебнаў. У ліку важнейшых задач, якія давялося вырашаць прадстаўнікам урадавых і цывільных службаў, на яшчэ не акупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі ў сакавіку 1917 г., з’яўлялася прадухіленне стыхійных выступленняў вясковага насельніцтва, скіраваных на захоп памешчыцкай, дзяржаўнай і іншай уласнасці, што магло істотна адбіцца на ходзе пасяўной і на памерах сельгаснарыхтоўкі.

У гэтай сувязі, неабходнае для дзяржавы сялянскае разуменне бягучых задач «свабоднай Расіі» ўвасаблялася ў першую чаргу ў неабходнасці чакання Устаноўчага сходу, каб вырашыць іх аграрныя патрэбы. Па-другое ва ўсведамленні імі сваёй галоўнай ролі – пасеўная збожжавых культур і актыўны ўдзел у нарыхтоўках сельгаспрадукцыі для акопнікаў і гараджан, а таксама ў дабрачынных праектаў. Старая сістэма нарыхтоўкі была непрымальнай па палітычных меркаваннях, а новая магла ажыццявіцца толькі з улікам добрай волі саміх хлебаробаў, аб’яднаных вакол дзяржаўных і грамадска-палітычных структур. Само сялянства, у сілу вядомых прычын было не ў стане згуртавацца і акрамя таго, да гэтага часу вялікай патрэбы ў тым не адчувала. Такім чынам, у гэты час дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы супадалі, што паспрыяла далейшаму актыўнаму супрацоўніцтву гэтых сіл. У ліку першай грамадскай установы, якая звярнула ўвагу на неабходнасць пашырэння грамадска-палітычнай асветы сялянства з’яўляўся Беларускі нацыянальны камітэт (далей БНК) і земскія камітэты. Паводле «Мінскай газеты» 10 сакавіка 1917 г. на «шматлюдным» мітынгу ў Мінску, старшыня БНК – П. П. Аляксюк і яго работнікі – У. Фальскі і А. Смоліч звярнуліся да мясцовых грамадскіх сіл «па пытанню аб арганізацыі беларускай вёскі». Лепшыя на той час інтэлектуальныя і матэрыяльныя сродкі для рэалізацыі гэтай задачы былі засяроджаны ў губернскіх, павятовых і заходнефрантавым камітэтах Земгара. Так у Мінску 19 сакавіка, ідэю рэалізацыі больш шырокай прапагандысцкай працы на вёсцы і заснавання

каардынацыйнай арганізацыі, падтрымалі на сходзе работнікі губернскага камітэта Усерасийскага Земскага Саюза. Арганізаваны Камітэт прапаганды на вёсцы новага ладу. Да ўдзелу запрашаліся ўсе асобы «асабліва свядомыя сяляне і народныя настаўнікі, наогул усіх хто меў жывую сувязь з вёскай, ведаў яе мову і звычаі, хто карыстаецца даверам». Адначасова быў распачаты выпуск 40 000 адозваў на рускай і беларускай мовах. У звароце да сялянства на старонках «Мінскай газеты» ад 21 сакавіка 1917 г. падкрэслівалася, што камітэт «шчыра і праўдзіва жадае дапамагчы яму разабрацца ў складаным дзяржаўным пераварoце», падрыхтаваць іх да выбараў ва Устаноўчы сход. Таксама, земляробам тлумачылася аб недапусцімасці гвалту да прыватнай маёмасці і пагрозах новаму дзяржаўнаму ладу. Акрамя гэтага матывам да згуртавання з'яўлялася нацыянальная самаідэнтыфікацыя.

Па меры свайго арганізацыйнага афармлення Камітэт наладжваў сувязь з іншымі дэмакратычнымі арганізацыямі і актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўчай рабоце па скліканню на 4 красавіка Краявога сялянскага з'езду Магілёўскай, Віленскай і Мінскай губерняў. Можна меркаваць, што па прычыне бездарожжа, аддаленасці вёсак ад чыгуначных вузлоў, камунікацый, гарадоў, недастаковай агітацыі і шэрагу іншых акалічнасцей на мінскі з'езд з'явілася 52 дэлегата. У меншай ступені была прадстаўлена Мінская губерня. Нягледзячы на недастакова прадстаўнічы склад, форум прыняў даволі прагрэсіўную рэзалюцыю. З'езд выступіў за мір без анексій і кантрыбуцый, дэмакратычную рэспубліку і вырашэнне зямельнага пытання на Устаноўчым сходзе паводле працоўнай нормы.

Аграрная праблема выклікала ў дэлегатаў з'езда пэўныя спрэчкі – за бясплатнае надзяленне сялянамі зямлёй – 24, супраць 15. Можна меркаваць, што ў сваім рашэнні аб арганізацыі валасных выканаўчых камітэтаў мясцовыя нацыянальныя сілы вырашылі выступіць у якасці ініцыятараў стварэння краёвых органаў кіравання. Натуральна, што апошняе выклікала адмоўную рэакцыю з боку агульнадзяржаўных грамадска-палітычных арганізацый – земства, Сялянскага саюза і інш. Наогул, рэзананс ад прынятых пастаноў быў невялікім. У Мінску ідэя стварэння такой сялянскай арганізацыі пачала ўвасабляцца 22 сакавіка 1917 г. У гэты дзень адбылася нарада групы сялянскіх дэлегатаў, якія прыехалі ў Мінск для выбараў губернскага харчовага камітэту. З удзелам асобных мясцовых грамадскіх дзеячоў было пастаноўлена склікаць «у найбліжэшы час губернскі сялянскі з'езд, а таксама арганізаваць сялянскі саюз». Назаўтра, 23 сакавіка адбылася яшчэ адна нарада, з больш шырокім колам удзельнікаў, дзе быў абраны

Губернскі сялянскі камітэт начале з «начальнікам Мінскай грамадзянскай міліцыі М. А. Міхайлавым».

«Вестник Минского губернского комиссариата» ад 29 сакавіка 1917 г. паведамляў, што новы камітэт пастанавіў «сваёй задачай умацаванне на вёсцы асноў новага ладу і арганізацыю працоўнага сялянства» і планаваў скліканне на 20 красавіка губернскага сялянскага з’езду. Блізкасць палітычных платформаў новага камітэта і Камітэта прапаганды новага ладу сведчыць пра тое, што ў стварэнні абодвух арганізацый прымалі ўдзел калі не адны і тыя ж, то людзі аднаго кола, аднаго светапогляду, у дадзеным выпадку – гэта служачых Усерасійскага Земскага саюза. У сваёй дзейнасці яны кіраваліся, перш за ўсё агульнадэмакратычнымі і дзяржаўнымі інтарэсамі. З умацаваннем новага ладу ствараліся ўмовы для паступовага вырашэння наспелых праблем вайскоўцаў, рабочых і сялян. Часовы ўрад ставіў іх рэалізацыю ў кантэксце дзяржаўных інтарэсаў. Вясной 1917 г. распачаліся з’езды Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Сялянскага саюза, якія заклікалі сялянства дапамагчы ўраду і рыхтавацца да Устаноўчага сходу, каб нарэшце вырашыць зямельнае пытанне і самае галоўнае ўдзельнічаць у ажыццяўленні харчовай кампаніі. Абраныя на іх выканкамы заняліся адпаведнай агітацыйнай і арганізацыйнай працай, папаўняючы свой склад новымі дэлегатамі. У параўнанні з Сялянскім саюзам, а таксама з грамадска-палітычнымі ўстановамі рабочых і салдат – Саветамі дэпутатаў, прафесійнымі саюзамі, фабрычна-завадскімі камітэтамі – фарміраванне Саветаў сялянскіх дэпутатаў значна запавольвалася. Саветам сялянскіх дэпутатам падлягала займацца вывучэннем зямельнага пытання; падрыхтоўкай сялянства да Устаноўчага сходу; даглядам за дзейнасцю органаў улады; прадстаўніцва інтарэсаў сялянства ва ўрадавых і грамадскіх арганізацыях.

Важнейшай падзеяй грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў красавіку стала скліканне Франтавога з’езда, які прайшоў у Мінскай губерні. Як было зазначана, яго ход адбываўся ў адпаведнасці з палітычным курсам Петраградскага Савета, а таксама ўсерасійскай нарады прадстаўнікоў Саветаў. Разам з тым, назіраліся свае асаблівасці, у прыватнасці, у абмеркаванні дэлегатамі Франтавога з’езда пытання аб праблемах з забеспячэннем фронту сельгаспрадуцыяй. Першасную ролю ў стварэнні сялянскіх Саветаў на Міншчыне адыгралі работнікі земскіх устаноў, Сялянскага саюза і ўладных структур (урадавыя камісары).

Да мая – чэрвеня 1917 г. на неакупараванай частківі Беларусі адбыліся з’езды Саветаў сялянскіх дэпутатаў губернскага, павятовага і валаснога ўзроўняў з арганізацыяй пастаянна дзеючых выканкомаў.